**РАВЕСНІКІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ**
Біяграфіі супрацоўнікаў БДУ, якія нарадзіліся ў 1945-м годзе
Стар. 2-3

**БДУ ПАДЧАС ВАЙНЫ: ФОТАХРОНІКА МІНУЛАГА**
Пра тое, які адбітак пакінулі на ўніверсітэце цяжкія ваенныя гады
Стар. 4-5

**ДЫНАСТЫІ БДУ**
Цыкл матэрыялаў, прысвечаны дынастыям студэнтаў і выкладчыкаў БДУ
Стар. 6-7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

21 мая 2025 года, №5 (2296)

# 80-ГОДДЗЕ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ АДЗНАЧЫЛІ Ў БДУ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да 80-годдзя Перамогі. Выкладчыкі, студэнты і супрацоўнікі ўніверсітэта сабраліся, каб успомніць подзвіг герояў і падкрэсліць важнасць захавання гістарычнай памяці ў сценах галоўнай ВНУ краіны.**



На ўрачыстым мерапрыемстве гучалі словы падзякі ўсім тым, хто ўнёс свой уклад у агульную Перамогу. Таксама традыцыйна калектыў БДУ шанаваў памяць тых, хто загінуў на вайне, хвілінай маўчання ля Стэлы памяці. Рэктар БДУ **Андрэй Кароль** падкрэсліў выключную значнасць доўгачаканай Перамогі для Беларусі і яе народа.

– Згодна з планам нямецкага камандавання, у Беларусі павінна была застацца толькі чвэрць насельніцтва. Мы вытрымалі дзякуючы неймаверным высілкам, але, на жаль, страцілі кожнага трэцяга нашага жыхара. У БДУ ў першыя дні вайны кожны трэці выкладчык і студэнт сышоў на фронт абараняць сваю краіну, – падзяліўся пэўнай фактalогіяй кіраўнік БДУ. У працяг думкі ён адзначыў, што гэта барацьба не заканчваецца сёння:

– Ужо пачынаючы з Фултанскай прамовы Чэрчыля ў 1946 годзе, ідзе барацьба за іншасць, самабытнасць кожнага народа, магчымасць выказваць сваю пазіцыю, а не распаўсюджваць адзіную мову, адзіныя каштоўнасці, адзіную валюту, адзіную ідэалогію і адзіную праўду на ўсе без выключэння краіны. Сёння засілле задавальнення, «адналькавага» значна страшнейшае, чым нават фізічны гвалт.

Са слоў Андрэя Караля, менавіта таму Дзень Перамогі – сакральная падзея:

– Важна заўсёды памятаць і паважаць Дзень Перамогі, паколькі гэтае свята ёсць не ва ўсіх краінах. На жаль, гэты факт сёння многія не могуць прызнаць, а парой і прабачыць. Таму ў гэтай падзеі закладзены не толькі гістарычны сэнс, – падкрэсліў рэктар. – Дзень Перамогі шмат у чым стаў своеасаблівым індыкатарам маральнага аблічча сучаснага грамадства, вызначае яго светапогляд і ўнутраныя якасці. Ад стаўлення да гістарычнай памяці, інтэрпрэтацыі тых падзей залежыць наша мінулае, рэчаіснасць і будучыня.

Таксама кіраўнік БДУ адзначыў, што сёння наша ментальнае супрацьстаянне скажэнню гісторыі знаходзіцца ў актыўнай фазе. На фоне перапісвання нядобразычлівцамі мінулага ў нашай краіне абнаўляюцца лічбы па колькасці ахвяр і разбурэнняў.

– Зараз ужо становіцца відавочна, што маладому пакаленню важна абараніць права называцца спадчыннікамі Перамогі, захаваць яго і перадаць будучым пакаленням адваяванае нашымі продкамі «званне Пераможцаў». Зрабіць гэта ва ўмовах штогадовага сыходу сведак тых падзей становіцца ўсё складаней. Бо разам з імі сыходзяць «жывая» памяць і напоўненыя сэнсамі размовы і сустрэчы.

Андрэй Кароль выказаў словы ўдзячнасці ветэранам ВАВ:

– Іх подзвіг, гераічнасць – гэта прыклад сапраўднага характару і волі, пацвярджэнне, што Перамога заўсёды на баку праўды.

Кіраўнік БДУ асабіста звярнуўся да аднаго з іх, дацэнта **Фёдара Фешчанкі**, які працаваў у БДУ з 1963 па 2002 год. У яго асобе кіраўнік ВНУ пажадаў усім ветэранам моцнага здароўя, настрою, бадзёрасці духу, актыўнасці і непарыўнасці сувязі пакаленняў.

У сваю чаргу Фёдар Фешчанка ў юбілейны для сябе і ўсёй краіны год асабліва цёпла распавёў пра Дзень Перамогі, падзяліўся першымі пачуццямі ад доўгачаканай падзеі:

– У 1945 годзе салдаты і мірныя грамадзяне яшчэ не ўсвядомілі той цуд, які адбыўся – Перамогу. І толькі праз дзесяцігоддзі яна стала важным святам у жыцці кожнага савецкага чалавека, – адзначыў Фёдар Фешчанка. – Я шчыра ўдзячны, што праз 80 гадоў трэцяе пакаленне спадчыннікаў Вялікай Перамогі, мае ўнукі і праўнукі, паважаюць памяць пра тых людзей, хто аддаў жыццё за спакой і мірнае неба.



Сваё запрашэнне на святкаванне памятнага дня ветэран назваў вельмі дарагім падарункам, які сімвалізуе пераемнасць і адзінства.

– Духоўная сіла беларускага народа ў Вялікай Перамозе, якую мы, ветэраны, перадалі ў надзейныя рукі, – са шчырасцю прамовіў Фёдар Фешчанка. Таксама ён пажадаў калектыву БДУ (асабліва студэнтам) ва ўсім прытрымлівацца чалавечых адносін, жыць паводле маральных прынцыпаў і захоўваць мір у роднай Беларусі.

Кульмінацыяй падзеі стала харэаграфічная пастаноўка. Пад мелодыю «Майскі вальс» сімвалічная колькасць студэнцкіх дуэтаў з усіх факультэтаў і інстытутаў БДУ – 80 – закружылася ў танцы.

У БДУ рэалізаваўся цыкл мерапрыемстваў да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў ВАВ. Гэта больш за 150 акцый і ініцыятыў: лекцыі, семінары, куратарскія і інфармацыйныя гадзіны, кніжныя выставы, а таксама экскурсійныя праграмы па маршрутах, найбольш памятных для беларускага народа.

У прыватнасці, каля 200 студэнтаў Беларусі і Расіі аб'ядналі двухдзённы Міжнародны моладзевы форум «Святло Вялікай Перамогі». Яго мэта – захаванне памяці пра гераічныя подзвігі нашых продкаў, перадача моладзі галоўных сэнсаў і каштоўнасцяў Перамогі, выказванне падзякі героям ВАВ.

Таксама ў БДУ завяршыўся праект «80 размоў пра вайну», які складаўся з трох тэматычных блокаў: «Размовы пра важнае», «Па слядах вайны», «Дыялог пакаленняў». Фармат сустрэч уяўляў сабой адкрыты дыялог паміж выкладчыкамі і студэнтамі, які дазволіў асвятліць значныя падзеі ваеннага перыяду. Студэнты змаглі задаць пытанні і пагутарыць з навукоўцамі ВНУ. Акрамя таго, на працягу двух месяцаў студэнты сустракаліся з супрацоўнікамі БДУ-ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны.

У БДУ праходзіў таксама цыкл мерапрыемстваў «Патрыятызм праз мастацтва», накіраваны на дэманстрацыю фундаментальнага асэнсавання вобраза вайны ў творах пісьменнікаў, скульптараў і кінематаграфістаў. Гэта былі лекцыі і адкрытыя дыялогі пра адлюстраванне падзей ВАВ у савецкай паэзіі і прозе, літаратурна-музычныя рэквіемы, наведванне аб'ектаў манументальнага мастацтва, сустрэчы з вядомымі рэжысёрамі і інш. Асветніцкі праект дазволіў паказаць моладзі ўнутраны бок вялікай трагедыі: пачуццё горычы, боль страты, радасць перамогі – праз творчую спадчыну культурных дзеячаў нашай краіны.

Акрамя ўніверсітэцкіх мерапрыемстваў, супрацоўнікі і студэнты БДУ прынялі ўдзел у гарадскіх і рэспубліканскіх акцыях, прымеркаваных да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 мая 2025 года, №5 (2296)

# РАВЕСНІКІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

**У гэтым годзе спаўняецца 80 гадоў супрацоўнікам БДУ, якія нарадзіліся ў 1945-м – у год заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Іх біяграфіі цесна звязаны з гісторыяй краіны і ўніверсітэта. Многія з іх прысвяцілі дзесяцігоддзі працы ў БДУ, выхавалі не адно пакаленне студэнтаў і працягваюць дзяліцца ведамі і вопытам. Успамінаем, якім быў іх шлях.**



***Ірына Сцяпанаўна Скарапанава***

**02.04.1945**

**Ірына Сцяпанаўна** – доктар філалагічных навук, прафесар кафедры рускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ. У 1967 годзе скончыла філалагічны факультэт па спецыяльнасці «філолаг, выкладчык рускай мовы і літаратуры». У 1972 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Ідэйна-мастацкія шуканні М. А. Булгакава (20-я гады)», а ў 2003 годзе – доктарскую – «Руская постмадэрнісцкая літаратура: тыпалогія, паэтыка, канцэптасфера». Сёння працягвае займацца даследаваннем актуальных пытанняў і праблем тэорыі літаратуры. Мае каля 300 навуковых публікацый.



***Валерый Васільевіч Хадасевіч***

**28.06.1945**

**Валерый Васільевіч** – вядучы спецыяліст па навучальным абсталяванні кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій фізічнага факультэта БДУ. Нарадзіўся ў Мінску. У 1967 годзе скончыў фізічны факультэт БДУ. Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў старшым лабарантам, асістэнтам, дацэнтам кафедры фізікі цвёрдага цела. У 1981 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю. Аўтар больш чым 200 навуковых прац па фізіцы. Падрыхтаваў 5 кандыдатаў навук.



***Віктар Міхайлавіч Анішчык***

**19.03.1945**

**Віктар Міхайлавіч** – прафесар кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій фізічнага факультэта БДУ. Нарадзіўся ў гарадскім пасёлку Наваельня Гродзенскай вобласці. У 1967 годзе скончыў фізічны факультэт БДУ. З 1970 года працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, прафесарам фізічнага факультэта. У 1972 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю, а ў 1990 – доктарскую. У 1986–1990 гады з'яўляўся старшынёй прафкама, у 1990–1991 – сакратаром парткама БДУ. З 1990 года загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела, з 1997 па 2018 год быў дэканам фізічнага факультэта БДУ. Аўтар больш чым 400 публікацый, у тым ліку шасці манаграфій, пяці навучальных дапаможнікаў, дзевяці вынаходстваў. Падрыхтаваў 3 дактароў і 15 кандыдатаў навук.



***Валянцін Юльянавіч Явід***

**27.09.1945**

**Валянцін Юльянавіч** – старшы навуковы супрацоўнік НДЛ спектраскапіі паўправаднікоў БДУ. Нарадзіўся ў Мінску. У 1969 годзе скончыў фізічны факультэт і ў тым жа годзе паступіў у аспірантуру БДУ. З 1971 года працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам спачатку на кафедры фізікі паўправаднікоў, а затым у НДІ ПФП. З 1978 па 1985 год з'яўляўся старшым навуковым супрацоўнікам у БНТУ і Інстытуце фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў НАН Беларусі. У 1985 годзе вярнуўся ў БДУ. У 1979 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Рэкамбінацыя на радыяцыйных дэфектах у германіі». Аўтар звыш 100 публікацый.



***Віталь Паўлавіч Дубкоў***

**19.08.1945**

**Віталь Паўлавіч** – старшы выкладчык кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Нарадзіўся ў Мінску. У 1967 годзе скончыў матэматычны факультэт БДУ і адразу пасля выпуску стаў выкладчыкам. Віталь Дубкоў распрацаваў лекцыйныя курсы па дысцыплінах «Праграмаванне», «Структуры даных», «Аперацыйныя сістэмы». Агульны стаж працы ў БДУ – 58 гадоў. За плённую працу ў галіне адукацыі і навукі ўзнагароджаны Граматай Міністэрства адукацыі Беларусі, падзякай рэктара БДУ і ганаровай граматай БДУ.



***Віталь Вікенцьевіч Альсевіч***

**04.01.1945**

**Віталь Вікенцьевіч** – прафесар кафедры метадаў аптымальнага кіравання факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (ФПМІ). Нарадзіўся ў Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці. У 1967 годзе скончыў БДУ і абараніў кандыдацкую дысертацыю. Стаў прафесарам у 2001 годзе. У БДУ працуе з 1977 года. Прымаў актыўны ўдзел у станаўленні спецыяльнасці «эканамічная кібернетыка» на ФПМІ. З 1996 года – лектар дысцыпліны «матэматычная эканоміка». Аўтар тыпавой праграмы і электроннага навучальна-метадычнага комплексу па «Матэматычнай эканоміцы», суаўтар тыпавой праграмы і электроннага навучальна-метадычнага комплексу па дысцыпліне «Метады аптымізацыі», а таксама суаўтар трох навучальных дапаможнікаў па метадах аптымізацыі. Пяццю выданнямі апублікаваны яго навучальны дапаможнік «Уводзіны ў матэматычную эканоміку: Канструктыўная тэорыя». Апошняе з гэтых выданняў выйшла ў 2021 годзе. Апрача манаграфіі і навучальных дапаможнікаў апублікаваў больш за 80 навуковых артыкулаў. Адзін з галоўных арганізатараў міжнародных навуковых канферэнцый «Дынамічная сістэмы: устойлівасць, кіраванне, аптымізацыя».



***Уладзімір Апанасавіч Вінарскі***

**30.11.1945**

**Уладзімір Апанасавіч** – вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ хіміка-аналітычных сістэм, кандыдат хімічных навук. Нарадзіўся ў Краснакамску (Расія). У 1967 годзе скончыў хімічны факультэт БДУ. Прайшоў шлях ад стажора-даследчыка да дацэнта кафедры аналітычнай хіміі. Навуковыя інтарэсы ўключаюць пытанні аналітычнай храматаграфіі. У розны час кіраваў і ўдзельнічаў у выкананні заданняў дзяржаўных праграм. Узнагароджаны знакам «Выдатнік вышэйшай школы СССР».



***Таццяна Андрэеўна Клімянкова***

**03.03.1945**

**Таццяна Андрэеўна** – лабарант II катэгорыі кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. Нарадзілася ў Мінску. У БДУ працуе больш за 40 гадоў. З'яўляецца супрацоўнікам факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій з першых дзён яго функцыянавання (1976). Узнагароджана медалямі да стагоддзя ўніверсітэта, ветэран працы.



***Фадзей Фадзеевіч Камароў***

**20.08.1945**

**Фадзей Фадзеевіч** – прафесар кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, акадэмік НАН Беларусі. Нарадзіўся ў в. Галузы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Пасля заканчэння з адзнакай фізіка-матэматычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута з 1969 па 1971 год працаваў стажорам-даследчыкам на фізічным факультэце БДУ. Пасля заканчэння вочнай аспірантуры БДУ працаваў старшым навуковым супрацоўнікам, а з 1975 года з'яўляўся загадчыкам лабараторыі эліёнікі НДІ ПФП, з 1981 па 1992 год – намеснікам дырэктара дадзенага інстытута па навуковай рабоце. У 1974 годзе абараніў кандыдацкую, а ў 1983 годзе – доктарскую дысертацыю. У 1980 годзе прысвоена навуковае званне дацэнта, у 1984 годзе – прафесара. Абраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі ў 1996 годзе. У 1998 годзе стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, у 2005 годзе – лаўрэатам прэміі імя А. Н. Сеўчанкі. Штогод з'яўляецца членам міжнародных аргкамітэтаў навуковых канферэнцый. Кіруе саветам па абароне доктарскіх дысертацый у БДУ. Падрыхтаваў 6 дактароў навук і 30 кандыдатаў навук, уключаючы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі з Германіі, Польшчы, В'етнама і Казахстана.



***Анатоль Іосіфавіч Саколік***

**19.09.1945**

**Анатоль Іосіфавіч** – дацэнт кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін біялагічнага факультэта. Нарадзіўся ў Екацярынбургу (Расія). У 1968 годзе скончыў фізічны факультэт БДУ. Затым працаваў асістэнтам на кафедры. У 1981 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Каліевыя каналы плазмалемы раслінных клетак». Удастоены Ганаровай граматы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2021), звання «Заслужаны работнік БДУ» (2019).



***Віктар Іванавіч Карзюк***

**04.04.1945**

**Віктар Іванавіч** – акадэмік НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры бія- і нанамеханікі ММФ БДУ. У розны час ён узначальваў ФПМІ (1979–1996), быў прарэктарам па вучэбнай рабоце БДУ (1996–2001), стаяў ля вытокаў стварэння Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі, стаў яго першым рэктарам (2002–2005). Віктар Іванавіч з'яўляецца аўтарам звыш 500 навуковых прац у галіне матэматычнай фізікі і дыферэнцыяльных ураўненняў з частковымі вытворнымі. Ім створаны новы метад энергетычных няроўнасцяў і апаратараў асераднення са зменным крокам, на аснове якіх вырашаны некаторыя недаступныя раней праблемы, даследаваны на вырашальнасць новыя задачы. Таксама вялікі ўклад Віктар Іванавіч унёс у даследаванні ў галіне мікраэлектронікі, якія звязаны з рашэннем задач іоннай імплантацыі. Пад яго кіраўніцтвам выкананы праекты па распрацоўцы матэматычных алгарытмаў і праграмнага забеспячэння сэрвісных модуляў для стварэння апаратыўных дзейных дынамічных мадэляў нафтавых пакладаў, а таксама новых тыпаў лазераў і святлодыёдаў. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1982), медалём «За працоўную доблесць» (1986), мае ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1996), з'яўляецца лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі нашай краіны (1996). У 2021 годзе матэматык быў адзначаны ордэнам Айчыны III ступені.



***Барыс Іларыёнавіч Бяляеў***

**16.04.1945**

**Барыс Іларыёнавіч** – прафесар, загадчык аддзела аэракасмічных даследаванняў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі БДУ. Нарадзіўся ў Чалябінску, у 1951 годзе сям'я пераехала ў Мінск. У 1969 годзе скончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут, размеркаваўся ў Інстытут фізікі АН БССР. Прайшоў шлях ад стажора-даследчыка да старшага навуковага супрацоўніка. У 1985 годзе па ініцыятыве рэктара БДУ акадэміка Леаніда Кісялеўскага быў пераведзены ў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі БДУ, дзе арганізаваў лабараторыю дыстанцыйнай фотаметрыі, а ў 2014 годзе стварыў аддзел аэракасмічных даследаванняў. Аўтар больш чым 350 навуковых публікацый. Сёння ён паспяхова развівае ў Беларусі навуковую школу ў галіне аэракасмічных даследаванняў. Таксама дзейнасць прафесара звязана з распрацоўкай прыбораў дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі аптычнага дыяпазону. У 1991 годзе ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР у галіне навукі і тэхнікі, адзначаны Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2011), Прэм'ер-міністра Беларусі (2015). Уладальнік Ганаровых грамат Міністэрства па надзвычайных сітуацыях (2011) і Міністэрства адукацыі (2015), ВАК «За шматгадовую плённую працу па падрыхтоўцы і атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі» (2016), Савета Міністраў (2016), адміністрацыі Прэзідэнта (2024). Узнагароджаны медалямі РКК «Энергія» імя С. П. Каралёва «За асабісты ўклад у стварэнне вырабаў ракетна-касмічнай тэхнікі» (2011), «За працоўныя заслугі» (2021).



***Людміла Валянцінаўна Кузіна***

**10.09.1945**

**Людміла Валянцінаўна** – старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных навук і ўстойлівага развіцця МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ. У 1967 годзе скончыла Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава (цяпер – БДЭУ). З 1970 па 1998 год працавала старшым навуковым супрацоўнікам у Цэнтральным НДІ інфарматыкі і тэхніка-эканамічных даследаванняў (Масква), а ў 1975 годзе паступіла ў аспірантуру Інстытута эканомікі НАН Беларусі. З 2005 года выкладае ў БДУ, педагагічны стаж працы ва ўніверсітэце – 20 гадоў. Распрацавала навучальна-метадычныя комплексы па дысцыплінах «Эканамічная тэорыя», «Эканоміка вытворчасці» і «Эканоміка і кіраванне арганізацыі», а таксама ўкараніла ў адукацыйны працэс навучальныя дапаможнікі і матэрыялы па выкладаных прадметах.



***Яўген Іванавіч Квасюк***

**06.06.1945**

**Яўген Іванавіч** – доктар хімічных навук, прафесар кафедры экалагічнай хіміі і біяхіміі МДЭІ імя А. Д. Сахарава. Нарадзіўся ў в. Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. У 1968 годзе скончыў хімічны факультэт БДУ, а праз два гады – аспірантуру. З 1970 па 1997 год працаваў у Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі АН БССР на пасадах старшага інжынера-тэхнолага, малодшага, старшага і вядучага навуковага супрацоўніка. З 2006 года працуе ў БДУ. Апублікаваў звыш 120 навуковых прац, у тым ліку больш за 40 англамоўных публікацый, тры навучальныя дапаможнікі, мае 44 аўтарскія пасведчанні СССР і сем патэнтаў розных краін на свае вынаходствы.



***Аляксандр Мікалаевіч Красоўскі***

**22.10.1945**

**Аляксандр Мікалаевіч** – кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры агульнага земляўнаўства і гідраметэаралогіі ФГГ БДУ. У 1967 годзе скончыў фізічны факультэт БДУ па спецыяльнасці «радыёфізіка і электроніка». Прысвяціў працы ў галоўнай ВНУ Беларусі больш за 50 гадоў. Пачынаў у 1974 годзе з пасады малодшага навуковага супрацоўніка, працаваў таксама старшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі аптычных сродкаў вымярэнняў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі. Таксама з 1997 па 2010 год займаў пост дырэктара Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ. У розныя гады працаваў дацэнтам напераменку на фізічным факультэце, а таксама геаграфіі і геаінфарматыкі. Пад кіраўніцтвам Аляксандра Красоўскага распрацаваны спектральныя прыборы для даследавання характарыстык сонечнага выпраменьвання і вызначэння складу атмасферы, якія выкарыстоўваюцца для маніторынгу ўтрымання азону і іншых малых складнікаў атмасферы на станцыях назіранняў у Беларусі і ў даследчай працы Беларускай антарктычнай экспедыцыі.

За сваю навукова-педагагічную дзейнасць удастоены Ганаровай граматы Міністэрства адукацыі Беларусі (2015), ганаровай граматы БДУ (2017 і 2023), падзякі рэктара БДУ (2020) і нагруднага знака «100 гадоў БДУ» (2021).



***Мікалай Максімавіч Пракапенка***

**20.10.1945**

**Мікалай Максімавіч** – сталяр 5 разраду ў студэнцкіх інтэрнатах БДУ. Нарадзіўся ў в. Пціч Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Пінскі гідрамеліярацыйны тэхнікум (цяпер – Пінскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж імя А. Я. Кляшчова) па спецыяльнасці «механік гідрамеліярацыйных прац». У 1972 годзе пераехаў у Мінск і ўладкаваўся на працу майстрам нарыхтоўчага цэха на завод «Мясамалмаш», пазней быў пераведзены ў вытворчы аддзел. У 1982 годзе пачаў працу механікам на аўтабазе «Мінскгандальаўтатранс». Пасля выхаду на пенсію Мікалай Максімавіч некалькі гадоў займаўся ўласнай справай: ствараў на замову розныя спарттавары. У БДУ працуе з 2023 года.



***Ала Анатольеўна Загароўская***

**26.05.1945**

**Ала Анатольеўна** – інжынер-праграміст I катэгорыі цэнтра адукацыйных інавацый юрыдычнага факультэта БДУ. У 1967 годзе скончыла матэматычны факультэт БДУ па спецыяльнасці «матэматык». З 1967 па 1994 год працавала ў Навукова-даследчым інстытуце электронных вылічальных машын. З 1996 года займае бягучую пасаду. Агульны стаж працы ў БДУ – 29 гадоў.



***Уладзімір Барысавіч Вікулаў***

**22.07.1945**

**Уладзімір Барысавіч** – вядучы інжынер па ахове працы ўпраўлення аховы працы БДУ. Нарадзіўся ў Гродне. Скончыў БНТУ па спецыяльнасці «інжынер-механік». У БДУ працуе з 2014 года. За плённую працу ў 2018 і 2024 гадах адзначаны падзякай і граматай БДУ адпаведна.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 мая 2025 года, №5 (2296)

# БДУ ПАДЧАС ВАЙНЫ: ФОТАХРОНІКА МІНУЛАГА

**У 1941 годзе ўніверсітэту спаўнялася 20 гадоў. Каб адзначыць гэтую ўрачыстую падзею, была прызначаная дата святкавання – 29 чэрвеня. Разам з перадсвяточнай ішла падрыхтоўка і да дзяржаўных выпускных іспытаў, якія планаваліся на 24–28 чэрвеня. А 22 чэрвеня павінна было адбыцца адкрыццё Камсамольскага возера. Але замест гэтага мінчане і госці горада, студэнты і выкладчыкі БДУ слухалі ўрадавае паведамленне пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны.**

За перыяд нямецкай акупацыі Мінск быў разбураны амаль на 80%. У архіве музея гісторыі БДУ захаваліся фатаграфіі, на якіх бачна, які адбітак пакінулі на ўніверсітэце цяжкія ваенныя гады.



**Руіны будынка педагагічнага факультэта, былое Камерцыйнае вучылішча. Фота 1944 – 1946 гадоў**

Універсітэту таксама было перададзена памяшканне Камерцыйнага вучылішча (пабудавана яшчэ ў пачатку XX стагоддзя), якое знаходзілася на тэрыторыі сучаснай плошчы Незалежнасці. Некаторы час тут функцыянавала педагагічнае аддзяленне БДУ, пазней будынак быў перададзены Інстытуту народнай гаспадаркі. Па звестках даследчыка М. І. Красоўскага, калі ў Мінску праводзіліся зямельныя працы па пашырэнні плошчы імя Леніна (зараз плошча Незалежнасці), пад руінамі былога будынка інстытута знайшлі склеп, у якім у гады вайны размяшчалася служба бяспекі рэйхсфюрара СС. Тут былі знойдзены шматлікія дакументы часоў фашысцкай акупацыі.



**Чырвонаармейская, 6**

Гэта былая мужчынская гімназія К. А. Фальковіча, якая размяшчалася на вуліцы Кашарскай, сучаснай Чырвонаармейскай. Менавіта яна стала будынкам БДУ №1. У ім размясцілася праўленне ўніверсітэта і некаторы час жыў першы рэктар БДУ Уладзімір Пічэта. У час вайны будынак быў амаль цалкам разбураны. Цяпер ён рэканструяваны, там размяшчаецца гістарычны факультэт БДУ.



**Нямецкія салдаты на фоне руін першага галоўнага корпуса БДУ**

У верасні 1921 г. Мінскі інстытут народнай адукацыі быў пераўтвораны ў педагагічны факультэт БДУ. Гэты будынак стаў першым галоўным корпусам універсітэта. Праз 10 гадоў педагагічны факультэт БДУ быў рэарганізаваны ў самастойны Беларускі дзяржаўны вышэйшы педагагічны інстытут, зараз гэта БДПУ імя М. Танка.



**Вышэйшая партыйная школа. Фота 1943 года**

Будынак быў пабудаваны ў 1937 годзе для размяшчэння Вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школы імя У. І. Леніна і Камуністычнага інстытута журналістыкі імя С. М. Кірава. Але падчас вайны будынак быў разбураны. У 1947 годзе яго аднавілі паводле праекта аўтара, дадаўшы элементы сталінскага класіцызму.

2 жніўня 1946 г. была прынята спецыяльная пастанова ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кіруючых партыйных і савецкіх работнікаў», згодна з якой Партыйная школа пры ЦК КП(б)Б у Мінску была пераўтворана ў Рэспубліканскую партыйную школу. Зараз гэта корпус філалагічнага факультэта.



**Універсітэцкі гарадок пасля вайны. Фота 1945 года**

У жніўні 1944 года, пасля вызвалення Беларусі, «сходненскі» перыяд дзейнасці ўніверсітэта скончыўся. Універсітэт быў у руінах. З навучальных карпусоў у працоўным стане застаўся толькі фізіка-матэматычны (сучасны рэктарат). Хуткімі тэмпамі пачаліся аднаўленчыя працы. Ужо ў канцы ліпеня 1944 года ў Мінск выехала група студэнтаў і выкладчыкаў (75 чалавек) для ўзнаўлення і падрыхтоўкі будынкаў да заняткаў.

11 жніўня 1944 г. другая група студэнтаў з 26 чалавек пад кіраўніцтвам прарэктара па гаспадарчай частцы В. У. Зубца (ён жа адначасова быў і студэнтам гістфака) адбыла ў Мінск. Неабходна было падрыхтаваць базу для пераезду астатніх выкладчыкаў і студэнтаў. Групу размясцілі ў фізіка-матэматычным корпусе, дзе зараз знаходзіцца рэктарат універсітэта, а падчас вайны там была тэлефонная станцыя. «У той час, – успамінае студэнтка біяфака В. К. Гаравец, – ён быў адзіным захаваным з карпусоў. Біялагічны і хімічны корпус былі спалены, у іх падчас вайны знаходзіўся нямецкі шпіталь».

Яшчэ ў 40-х гадах былі адноўлены біяфак і хімфак, пабудаваны студэнцкія інтэрнаты па вуліцы Бабруйская, 7 і 9. Для будаўніцтва ствараліся студэнцкія працоўныя атрады, якія актыўна ўдзельнічалі ў аднаўленні БДУ.

У справаздачы пра дзейнасць універсітэта за 1944/1945 навучальны год адзначаецца, што ён быў самым цяжкім у гісторыі БДУ.



**Будынак духоўнай кансісторыі**

Будынак пабудаваны ў сярэдзіне XIX стагоддзя (паводле некаторых звестак, у 1864 годзе) у складзе комплексу архірэйскага падворка для размяшчэння кансісторыі, а таксама жылля мінскага епархіяльнага архітэктара. Кансісторыя дзейнічала да 1924 года. У савецкі перыяд у будынку размяшчаўся музей гісторыі войскаў Беларускай ваеннай акругі.

Будынак быў перададзены БДУ, і ў 2004 годзе там пачаў дзейнасць Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла.



**Раён вуліцы Чырвонаармейскай пасля налёту нямецкай авіяцыі**

У чэрвені 1942 года кіраўніцтва вышэйшага партыйнага органа рэспублікі абмеркавала пытанне аднаўлення дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў складзе трох факультэтаў – філалагічнага, гістарычнага і геаграфічнага.

15 мая 1943 года была прынятая пастанова аб аднаўленні працы БДУ ў эвакуацыі. Універсітэт размясцілі на чыгуначнай станцыі «Сходня» – раней гэта было Падмаскоўе, зараз рыса горада. Менавіта сюды згодна з пастановай з'язджаліся студэнты і выкладчыкі для працягу вучобы.

Афіцыйна заняткі ва ўніверсітэце пачаліся 11 кастрычніка 1943 г. На аднойленых шасці факультэтах – філалагічным, гістарычным, біялагічным, геаграфічным, хімічным, фізіка-матэматычным – пачалі вучыцца каля 300 студэнтаў. На 1 снежня 1943 года ў БДУ працавала 90 выкладчыкаў.

**Матэрыял падрыхтавалі**
**музей гісторыі БДУ і Ганна КАЗАКОВА**

# «ПРА ПОДЗВІГ НАРОДА ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ»



**Яўген Міхайлавіч Бабосаў, доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, не толькі выбітны навуковец, але і сведка вайны. Яго сведчанне – напамін пра тое, якая цана мірнага неба над галавой.**

**Яўген Міхайлавіч, якія ўспаміны ў вас захаваліся пра той час, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна?**

На ўсё жыццё ўрэзаўся ў маю памяць пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Я ў той час вучыўся ў трэцім класе. Я яшчэ не быў піянерам, але мне падабалася наведваць Палац піянераў і спяваць у хлапечым хоры, у якім удзельнічалі і іншыя школьнікі малодшых класаў з розных школ Мінска. Мы спявалі песню «Броня крепка, и танки наши быстры!». У першы раз у жыцці ў нядзелю 22 чэрвеня 1941 года мая мама дала мне доўгія чорныя штаны і белую кашулю, каб я добра выглядаў пры выступленні хору. І ў гэты час раздаецца крыху хрыплаваты, як бы надтрэснуты голас тагачаснага старшыні Савета Міністраў СССР Вячаслава Міхайлавіча Молатава. Ён абвясціў, што пачалася Вялікая Айчынная вайна. А мая мама ў гэты момант несла мне талерку супу. Гэта талерка звалілася і разбілася. І я здрыгануўся. І мы адчулі ўвесь жах пачатку вайны фашысцкай Германіі супраць Савецкага Саюза.

**Якія пачуцці вы адчувалі ў той момант, калі даведаліся пра абвяшчэнне вайны?**

Гэта было ўсё разам: і роспач, і страх, і мужнасць, і вера, і ўпэўненасць, і надзея. Усё сплялося ў адзіны клубок. І гэта мы з маці адчулі.

**Што ваша мама вырашыла рабіць далей?**

Бацька ў той час быў у камандзіроўцы. Ён працаваў у мінскім абласным зямельным аддзеле і прыехаў толькі на трэці дзень, калі ўсе, акрамя мяне з маці, з нашага 6-кватэрнага дома з'ехалі ў эвакуацыю. А мама сказала: «Пакуль не прыедзе бацька, нікуды не сыходзім». Калі бацька прыехаў, ён сказаў, каб мы хутка збіраліся, таму што эшалоны адпраўляюцца ў эвакуацыю, трэба паспець і дабегчы». І мы беглі ад Зенітнага завулка, дзе мы жылі, да станцыі, селі ў таварны эшалон і паехалі на ўсход. А тым часам дзесьці ў раёне Смалявічаў нас атакаваў нямецкі зенітны штармавы бамбардзіроўшчык «Фоке Вульф 190». Гэта я ўжо потым яго назву даведаўся. І таксама пазней даведаўся, што, калі ён атакуе, пачынае пікіраваць, ён уключае выццё сірэны, што я памятаю дагэтуль.

**Што адбылося далей, Яўген Міхайлавіч?**

Мы вярнуліся ў Мінск. Я бачыў, што, калі вешалі немцаў за здзяйсненне злачынстваў падчас аку-пацыі Мінска, рабілі гэта па ранжыры. Першым – генерал-лейтэнанта, другім – палкоўніка і гэтак далей.

**Якімі ўспамінамі вы вымяраеце вайну?**

Першае: хуткімі крокамі наступае наш няпоўны, каля 30 чалавек, узвод, і апошнім у шэрагу, у сінім даваенным касцюме, які вылучаецца на фоне ўзвода, ідзе мой бацька. І другое: жудасна хацелася есці. Увесь час хацелася есці, а есці не было чаго.

**Якім было ваша жыццё пасля вяртання ў Мінск?**

Калі мы з мамай вярнуліся з эвакуацыі, якая не адбылася, у нашым доме пасялілася жанчына з дзвюма дочкамі. Яна з самага пачатку вайны была ў адносінах з акупантамі. Маці маёй яна сказала: «Ты бальшавіцкая набрыдзь. Вось табе рэчы, мне яны не патрэбныя. Будзеш за кошт гэтага жыць. Але каб больш ніколі ты на парозе гэтага дома не з'яўлялася». Мы сышлі і пасяліліся на вуліцы Дзекабрыстаў у доме без шкла і дзвярэй. Усе рэчы мама абменьвала. За кошт гэтага мы пражылі галодную, халодную, страшную акупацыйную зіму.

**Якія падзеі таго часу вам лепш за ўсё запомніліся?**

Калі было нанесена паражэнне германскім войскам і пра гэта стала вядома – як жа мы радаваліся. Я памятаю, як ляцеў глыбокай ноччу жаночы авіяцыйны гвардзейскі полк, які немцы называлі «Начныя ведзьмы», сігналы нямецкай трывогі, выццё сірэн, і ў святле пражэктараў можна было ўбачыць савецкі самалёт. Ён скінуў лістоўкі, у якіх было напісана: «Паважаныя жанчыны, жыхаркі горада Мінска. Чакайце нас. Мы хутка вернемся. І перамога будзе за намі». Я доўга захоўваў гэту лістоўку і здаў яе ў музей Вялікай Айчыннай вайны, таму што ўсе павінны пра гэта ведаць.

**Распавядзіце, калі ласка, пра вашу першую працу.**

Сусед мне сказаў, што я рослы, і прапанаваў уладкаваць мяне на працу, каб я атрымліваў працоўную картку і была магчымасць выжыць. Я ўладкаваўся на завод Мяснікова. Мы збівалі там скрыні для снарадаў. Гэта была першая мая праца. Я нідзе яе не ўказваў, хоць гэта быў мой першы працоўны стаж. Па картачнай сістэме я атрымліваў 600 г хлеба і крупы. І там я прапрацаваў, пакуль не вярнуўся з фронту бацька.

**А што вы памятаеце пра заканчэнне вайны?**

Мінск бамбілі. Горад гарэў. Мы сядзелі ў бамбасховішчах. З намі быў самавіты мужчына. І тым часам раздаўся рокат. І мужчына сказаў, што гэта едуць савецкія танкі. Усе здзівіліся, а ён папрасіў, каб усе прыслухаліся да шуму. У нашых танкаў іншы рокат, не такі, як у нямецкіх. І мы ўскочылі і пабеглі па вуліцы Дзекабрыстаў, на вуліцу Грушаўскую. І там – уздоўж чыгункі, да заходняга моста. Чаравікі мне ціснулі. Я адчуваў, што адстаю ад іншых хлапчукоў. Я іх скінуў і панёсся басанож па бітым шкле. І мы выскачылі да Камсамольскай вуліцы. А там беглі нашы жанчыны і атачылі савецкі танк, на якім сядзелі салдаты-чырвонаармейцы. З танка выйшаў старшына, узяў на рукі маленькую дзяўчынку, пачаў яе гладзіць па валасах, дастаў з салдацкіх штаноў два жоўклыя кавалачкі цукру. А яна ніколі не бачыла гэты цукар і не ведала, што гэта такое. Яна ўзяла яго асцярожна, паглядзела на маму, якая ёй сказала, каб яна яго ела. Дзяўчынка яго пакаштавала, і на твары ў яе з'явілася ўсмешка. Гэта асаблівае адчуванне.

**Ваш бацька вярнуўся жывым з вайны?**

Ён быў паранены чатыры разы, з якіх два раненні былі лёгкімі (у руку і нагу), а два – цяжкімі. Каля Ржэва быў выпадак, калі побач з бацькам падарваўся нямецкі снарад і перабіў абедзве нагі. Немцы набліжаліся. Ён дастаў пісталет і папрасіў свайго баявога таварыша прыстрэліць яго, каб не здавацца ў палон. Але чырвонаармеец адмовіўся, пасадзіў яго на плечы і панёс 3 кіламетры. Але потым паклаў на шынель і пацягнуў І 6 кіламетраў у жудасны холад. Пасля ў бацькі было сур'ёзнае захворванне лёгкіх. Але яны абодва засталіся жывыя. З часоў вайны ўлюбёнай песняй бацькі, а зараз і маёй, стала песня Леаніда Уцёсава «В землянке».

**Якую параду вы маглі б даць сучаснаму пакаленню? Ці важна захоўваць гэтыя ўспаміны?**

Гэта ўспаміны на ўсё жыццё. Пра подзвіг народа павінен ведаць кожны, таму што нельга, каб вайна паўтарылася. Вялікая перамога – самае святое, што ёсць у гістарычнай памяці народа.

**Юлія БАНЬКОЎСКАЯ,**
**доктар філасофскіх навук,**
**прафесар кафедры культуралогіі БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 мая 2025 года, №5 (2296)

# ДЫНАСТЫЯ ПЯТРОВІЧА, УЛАЗАВАЙ, МАКСІМАВАЙ: 120 ГАДОЎ З БДУ



*П. Р. Пятровіч з удзельнікамі гідрабіялагічнай канферэнцыі, прысвечанай яго 90-гадоваму юбілею*

**Дынастыю складаюць кандыдат і доктар біялагічных навук, кандыдат хімічных навук, аўтары навуковых распрацовак, навучальна-метадычных публікацый. Педагагічны стаж дынастыі Пятровіч, Улазава, Максімава ў БДУ – 120 гадоў.**



**Пятровіч Павел Рыгоравіч** – кандыдат біялагічных навук, дацэнт, дэкан біялагічнага факультэта БДУ ў 1953 – 1972 (бацька Максімавай Н. П.). Педагагічны стаж у БДУ – 38 гадоў.

Нарадзіўся 24 лістапада 1909 г. у вёсцы Лучнікі Слуцкага раёна Мінскай губерні. У 1929 г. скончыў Слуцкае педагагічнае вучылішча. Працаваў у Коленскай пачатковай школе Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці настаўнікам, загадчыкам выхаваўчага аддзела. У 1933 – 1938 гг. навучаўся на біялагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля навучання быў накіраваны ў Гомельскі педінстытут, дзе займаў пасаду асістэнта, затым – старшага выкладчыка.

У 1939 годзе быў мабілізаваны. Браў удзел у савецка-фінскай вайне, быў цяжка паранены. Пасля лячэння вярнуўся ў Гомельскі педінстытут. Падчас Вялікай Айчыннай вайны кіраваў эвакуацыяй інстытута. Пасля гэтага быў накіраваны ў Маскву, дзе працаваў у Батанічным садзе Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставы (зараз ВДНГ).

У 1943 – 1946 гг. займаў пасаду загадчыка аддзела педагагічных вучылішчаў Наркамасветы БССР. У 1946 годзе П. Р. Пятровіч вярнуўся ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе заняў пасаду старшага навуковага супрацоўніка кафедры біялогіі. У 1952 г. П. Р. Пятровічу было прысвоена званне кандыдата біялагічных навук, у 1955 г. – званне дацэнта.

З 1953 г. па 1971 г. займаў пасаду дэкана біялагічнага факультэта БДУ. У перыяд працы П. Р. Пятровіча на пасадзе дэкана на факультэт быў запрошаны для педагагічнай і навуковай працы шэраг вядомых спецыялістаў такіх, як акадэмік АН СССР Ракіцкі П. Ф., акадэмік АН БССР Турбін М. В., генетык, акадэмік АН БССР Вечар А. С. Былі адкрыты і сфарміраваны калектывы кафедраў мікрабіялогіі (1960), біяхіміі (1964), адбыўся падзел кафедры дарвінізму і генетыкі і фізіялогіі чалавека і жывёл на дзве незалежныя кафедры (1957), створаны навуковыя школы па новых сучасных напрамках біялогіі, якія паспяхова працуюць і ў наш час. П. Р. Пятровіч прыняў самы непасрэдны ўдзел у арганізацыі даследчых прац і правядзенні гадавых практык студэнтаў на возеры Нарач.

У 1967 – 1974 гг. з'яўляўся загадчыкам кафедры заалогіі беспазваночных. У 1962 – 1982 гг. займаў пасаду старшыні Беларускага аддзялення Усесаюзнага гідрабіялагічнага грамадства Акадэміі навук СССР, з 1971 па 1987 год быў членам яго вучонага савета. Да 1984 г. з'яўляўся дацэнтам кафедры агульнай экалогіі біялагічнага факультэта БДУ.

Займаўся вывучэннем пытанняў біялагічнай прадуктыўнасці зоапланктону азёр, рэк і вадасховішчаў. Кіраваў комплексным гідрабіялагічным даследаваннем водных аб'ектаў Беларусі. Аўтар больш чым 100 навуковых і метадычных прац. Пад яго кіраўніцтвам абаронена 4 кандыдацкія дысертацыі.

Павел Рыгоравіч быў узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.», медаль «У памяць 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна» і інш.



**Улазава Ганна Раманаўна** – кандыдат хімічных навук, дацэнт (жонка П. Р. Пятровіча). Педагагічны стаж у БДУ – 31 год.

Нарадзілася Ганна Раманаўна 15 сакавіка 1923 г. у г. Мазыр. Да жніўня 1940 г. навучалася ў сярэдняй школе Мазыра.

Пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася ў партызанскім атрадзе імя Будзённага.

У 1945 г. паступіла ў БДУ на хімічны факультэт. У 1950 г. стала выпускніцай універсітэта. Пасля завяршэння вучобы ў 1950 – 1953 гг. працавала на кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ на пасадзе старшага лабаранта. У 1953 – 1956 гг. з'яўлялася лекцыйным асістэнтам кафедры, затым – асістэнтам.

У 1964 г. Г. Р. Улазава абараніла кандыдацкую дысертацыю. У 1965 г. ёй была прысуджана навуковая ступень кандыдата хімічных навук, у 1969 г. – званне дацэнта.

У 1972 г. Ганна Раманаўна з'яўлялася слухачом факультэта павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў вышэйшых навучальных установаў МДУ імя М. В. Ламаносава па спецыяльнасці «неарганічная хімія».

Ганна Раманаўна ажыццяўляла актыўную навуковую дзейнасць. Стала аўтарам дзевяці навучальных дапаможнікаў і сямі навуковых артыкулаў. Сярод найбольш вядомых «Зборнік пытанняў і практыкаванняў па неарганічнай хіміі» 1965 г. і 1967 г., «Практыкум па неарганічнай хіміі» 1969 г.

Ганна Раманаўна працягнула працу на кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта БДУ да 1981 г.

Г. Р. Улазава была ўзнагароджана медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені. У 1973 г. была ўзнагароджана ганаровай граматай рэктара за шматгадовую навукова-выкладчыцкую працу і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння.



**Максімава Наталля Паўлаўна** – доктар біялагічных навук, прафесар (дачка Пятровіча П. Р.). Педагагічны стаж у БДУ – 51 год.

Нарадзілася 16 лютага 1948 г. у г. Мінску. У 1966 – 1971 гг. навучалася на біялагічным факультэце БДУ. У 1971 г. паступіла ў аспірантуру біялагічнага факультэта на кафедру генетыкі і дарвінізму. У 1975 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю.

З 1974 г. па 1985 г. працавала ў праблемнай НДЛ эксперыментальнай біялогіі БДУ. У 1985 г. была прызначана загадчыцай сектара біяхімічнай генетыкі бактэрый гэтай жа лабараторыі, а з 1992 г. – загадчыцай НДЛ малекулярнай генетыкі бактэрый. У 1995 г., застаючыся кіраўніком гэтага навуковага падраздзялення, Н. П. Максімава становіцца загадчыцай кафедры генетыкі біялагічнага факультэта БДУ.

У 2005 г. абараніла доктарскую дысертацыю. У 2006 г. Н. П. Максімавай было прысвоена званне прафесара.

Пад яе кіраўніцтвам у Беларускім дзяржаўным універсітэце быў сфарміраваны новы навуковы напрамак, звязаны з расшыфроўкай біяхімічных і генетычных асноў сінтэзу біялагічна актыўных злучэнняў араматычнай прыроды ў мікраарганізмаў (амінакіслот, пігментаў, стымулятараў росту раслін і інш.)., прыдатных для практычнага выкарыстання.

Упершыню ўсталяваны біясінтэтычныя папярэднікі флуарэсцыруючага пігменту піявердзіну, а таксама выяўлена яго высокая антыаксідантная і антымікробная актыўнасці. Распрацаваны новыя падыходы стварэння генетычнымі метадамі прадуцэнты феназінавых антыбіётыкаў, мікробных флуарэсцыруючых пігментаў, араматычных амінакіслот, флуарэсцыруючых пігментаў, стымулятараў росту раслін, а таксама шэрагу іншых карысных метабалітаў перспектыўных у біятэхналагічных адносінах. Створаны штамы-прадуцэнты дадзеных злучэнняў, прыдатныя для практычнага выкарыстання ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. У рамках інавацыйных праграм створаны экалагічна бяспечныя біяпестыцыдныя прэпараты, прыдатныя для практычнага выкарыстання. У наш час пад яе кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле распрацавана і створана сем біяпестыцыдных прэпаратаў для абароны раслін («Бактаген», «Аўрын», «Стымул», «Немацыд», «Гулівер», «Жыцень» і «ПафіБакт-фіта»), якія ўкаранёны ў вытворчасць Рэспублікі Беларусь і выпускаюцца на прадпрыемствах Рэспублікі Беларусь (ААТ «Бабруйскі завод біятэхналогій» і ТАА «Цэнтр інавацыйных тэхналогій»).

Апублікавана больш за 1 100 навуковых прац у нашай краіне і за яе межамі, уключаючы 11 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў.

Н. П. Максімава была ўзнагароджана ў 2003 г. нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», у 2008 – 2009 гг. з'яўлялася стыпендыятам Прэзідэнцкага фонду Рэспублікі Беларусь, у 2011 г. была адзначана Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у 2012 г. была ўдастоена ганаровага звання «Заслужаны работнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта», у 2013 г. узнагароджана медалём Рэспублікі Беларусь «За працоўныя заслугі», у 2014 г. была прысуджана прэмія імя А. Н. Сеўчанкі за навучальна-метадычны комплекс «Асновы клетачных, малекулярных і генетычных механізмаў арганізацыі і развіцця жывых сістэм».

За шматгадовы ўклад у развіццё адукацыі і навукі прадстаўнікі дынастыі былі ўдастоены мноства ганаровых узнагарод. Даследаванні навукоўцаў з'яўляюцца актуальнымі і на дадзены момант.

**Дар'я АРТАМОНАВА**

# ДЫНАСТЫЯ ЧЫГІРА, ПАПОВАЙ, СВАДКОЎСКАЙ: 114 ГАДОЎ РАЗАМ З БДУ

**Дынастыю складаюць доктар юрыдычных навук, прафесар, кандыдаты юрыдычных навук, дацэнты, аўтары навуковых прац, члены аўтарскіх калектываў. Педагагічны стаж дынастыі ў БДУ – 114 гадоў.**



**Чыгір Васіль Фёдаравіч** – доктар юрыдычных навук, прафесар, дэкан юрыдычнага факультэта (1973–1983 гг.). Педагагічны стаж у БДУ – 68 гадоў.

Нарадзіўся 8 верасня 1924 г. у в. Лешня Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

У 1949 г. скончыў Мінскі юрыдычны інстытут, у 1952 г. – аспірантуру. З 1950 г. працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам Мінскага юрыдычнага інстытута. У 1954–1956 гг. – старшы выкладчык юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У 1954 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1970 г. – доктарскую. У 1971 г. Васілю Фёдаравічу было прысвоена навуковае званне доктара юрыдычных навук. У гэтым жа годзе за вялікія поспехі ў развіцці навукі, у падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў для народнай гаспадаркі было прысвоена ганаровае званне заслужанага юрыста БССР. У 1973 г. было прысвоена навуковае званне прафесара.

З 1973 г. па 1983 г. з'яўляўся дэканам юрыдычнага факультэта БДУ.

З 1972 г. па 1993 г. узначальваў кафедру грамадзянскага права, падрыхтаваў больш за 20 кандыдатаў і аднаго доктара навук. В. Ф. Чыгір – стваральнік навуковай школы па жыллёвым праве, па гэтым галіновым напрамку падрыхтаваў 8 кандыдатаў навук.

Аўтар больш чым 550 публікацый, з якіх 20 – кнігі. Васіль Фёдаравіч браў удзел у падрыхтоўцы падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для студэнтаў вышэйшых юрыдычных навуковых устаноў па грамадзянскім праве, сямейным і жыллёвым праве. Аднаасобная манаграфія «Савецкае жыллёвае права» ў трох частках выйшла ў 1960, 1962, 1964 гг., у 1968 г. быў выдадзена аднайменны навучальны дапаможнік, а ў 1986 г. выйшла 2-е выданне.

Васіль Фёдаравіч – кіраўнік аўтарскага калектыву, аўтар шэрагу частак і галоўны рэдактар навучальнага дапаможніка «Грамадзянскае права» ў трох тамах (1975, 1977, 1978), навучальнага дапаможніка «Савецкае сямейнае права» 1989 г., падручніка «Грамадзянскае права» ў дзвюх частках (2000, 2002), падручніка «Грамадзянскае права» ў трох тамах (2008, 2010, 2011).

Пад кіраўніцтвам В. Ф. Чыгіра былі падрыхтаваны навукова-практычныя каментарыі да Грамадзянскага кодэкса Беларускай ССР 1972 г. і 1991 г., каментарый да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь у дзвюх кнігах 1999 г., каментарый да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (паартыкульны) у трох тамах 2003 г., каментарый да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь з дадаткам актаў заканадаўства і судовай практыкі (паартыкульны) у трох кнігах 2005, 2006 гг.

Васіль Фёдаравіч прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці дзяржаўных органаў. Уваходзіў у працоўную групу па падрыхтоўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., праекта Грамадзянскага кодэкса БССР 1964 г., Жыллёвага кодэкса БССР 1983 г., Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1998 г., а таксама трох частак Мадэльнага грамадзянскага кодэкса для краін СНД. З'яўляўся членам навукова-кансультатыўных саветаў пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь і Вышэйшым Гаспадарчым Судзе Рэспублікі Беларусь.

У 1994–1998 гг. – старшыня экспертнага савета па юрыдычных навуках ВАК Рэспублікі Беларусь. Узначальваў савет па абароне доктарскіх дысертацый па юрыдычных навуках пры Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Навуковая і грамадская дзейнасць В.Ф. Чыгіра ніколі не абмяжоўвалася межамі нашай краіны. Быў добра вядомы як бачны навуковец не толькі ў СССР, але і ў іншых дзяржавах, прычым у краінах як блізкага і далёкага замежжа, чытаў лекцыі ў шэрагу замежных універсітэтаў. Выступаў апанентам для значнай колькасці доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый на постсавецкай прасторы ў Маскоўскім і Ленінградскім універсітэтах, Харкаўскім юрыдычным інстытуце і інш.

За высокія заслугі Васіль Фёдаравіч быў узнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны I і II ступені, Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, ганаровымі граматамі БДУ ў 1974, 1975, 1981, 2003, 2005 гг.

У 2006 г. яму была прысуджана вышэйшая юрыдычная прэмія «Феміда» ў намінацыі «Юрыдычныя навукі», у гэтым жа годзе ён быў узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

У 2010 г. Васілю Фёдаравічу было прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка БДУ.

Працоўную дзейнасць В. Ф. Чыгір завяршыў у 2018 г.

Васіль Фёдаравіч адзначыў свой 100-гадовы юбілей з сям'ёй, а 17 снежня 2024 г. ён сышоў з жыцця.



**Папова Ірына Васільеўна** – кандыдат юрыдычных навук, дацэнт. Педагагічны стаж у БДУ – 25 гадоў (дачка Чыгіра В. Ф.).

Нарадзілася 4 снежня 1953 г. у г. Мінску. У 1976 г. скончыла факультэт прыкладной матэматыкі БДУ па спецыяльнасці «матэматык». Пасля заканчэння ўніверсітэта пачала працу ў Навукова-даследчым інстытуце электронных вылічальных машын. Распрацоўвала праграмы, якія ўваходзяць у аперацыйныя сістэмы камп'ютараў, што выпрацоўваліся ў Рэспубліцы Беларусь.

У 1994 г. Ірына Васільеўна заняла пасаду дзяржаўнага службоўца Беларускага інстытута дзяржаўнага будаўніцтва і заканадаўствы (у наш час – Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь), у якім прапрацавала да 2009 г. Мае трэці клас дзяржаўнага службоўца.

У 1999 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю па юрыспрудэнцыі на тэму «Праграма ЭВМ у сістэме аб'ектаў аўтарскага права». З гэтага года пачала выкладчыцкую дзейнасці на кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ ў якасці знешняга сумяшчальніка, а з 2009 г. перайшла ў штат дадзенай кафедры. У 2012 г. Ірыне Васільеўне было прысвоена навуковае званне дацэнта.

У наш час выкладае дысцыпліну «Грамадзянскае права, частка другая» на юрыдычным факультэце.

З'яўлялася членам Навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Аўтар больш чым 30 навуковых публікацый, у тым ліку шэрагу частак у навучальных выданнях «Грамадзянскае права», «Асновы права», каментарыяў да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.



**Свадкоўская Алена Аляксандраўна** – кандыдат юрыдычных навук, дацэнт. Педагагічны стаж у БДУ – 21 год (унучка Чыгіра В. Ф.).

Нарадзілася 1 ліпеня 1980 г. у г. Мінску. У 2002 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ. У гэтым жа годзе Алена Аляксандраўна стала лаўрэатам Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння ўніверсітэта працавала малодшым навуковым супрацоўнікам, навуковым супрацоўнікам аддзела працоўнага і грамадзянскага права Інстытута дзяржавы і права НАН Беларусі.

З 2003 г. Алена Аляксандраўна па сумяшчальніцтве працавала выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта БДУ. У 2004 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю.

З 2005 г. загадвала сектарам грамадзянскага права Інстытута дзяржавы і права НАН Беларусі. У 2007 г. Алене Аляксандраўне было прысвоена навуковае званне дацэнта.

У 2009–2015 гг. займала пасаду галоўнага спецыяліста Навукова-практычнага цэнтра праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

У 2015 г. пачала працу ў Сакратарыяце Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у якасці саветніка-кансультанта экспертна-прававога ўпраўлення, потым працягнула на пасадзе галоўнага саветніка ўпраўлення рэгіянальнай палітыкі і мясцовага самакіравання.

З 2018 па 2021 г. – вучоны сакратар экспертнага савета па юрыдычных навуках ВАК Рэспублікі Беларусь, у 2023–2024 гг. – вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДУ.

З 2022 г. з'яўляецца загадчыкам кафедры права інтэлектуальнай уласнасці юрыдычнага факультэта БДУ.

У наш час чытае курсы лекцый па навучальных дысцыплінах «Права інтэлектуальнай уласнасці», «Лічбавыя правы ў грамадзянскім звароце», «Права ўласнасці і іншыя рэчавыя правы», «International Protection of Intellectual Property Rights», «Copyright in Digital Sphere», «Industrial Property Law: Patents and Trademarks» на юрыдычным факультэце, а таксама «Асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю» на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, механіка-матэматычным факультэце.

Аўтар больш чым 110 навуковых прац, сярод якіх аднаасобныя манаграфія, метадычныя рэкамендацыі, часткі ў падручніках, навучальных дапаможніках, практыкуме, шэрагу каментарыяў да Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

У 2023 г. А. А. Свадкоўская ўзнагароджана граматай Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці за высокі прафесіяналізм і вялікі асабісты ўнёсак у папулярызацыю інтэлектуальнай уласнасці.

Дынастыя зрабіла вялікі ўклад у развіццё юрыспрудэнцыі Рэспублікі Беларусь. Прадстаўнікі дынастыі ўслаўляюць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт як высокакваліфікаваныя спецыялісты.

**Дзмітрый СЦЯПАНАЎ,**
**дырэктар музея гісторыі БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
21 мая 2025 года, №5 (2296)

# СЛАВУТЫ ШЛЯХ ЛЁТЧЫКА

**Дарагі мой бацька, Мікалай Лявонцьевіч Губіна, нарадзіўся ў 1923 годзе. У 20-гадовым узросце ў званні малодшага лейтэнанта быў лётчыкам 152 гвардзейскага знішчальнага авіяцыйнага Сандамірскага ордэнаў Багдана Хмяльніцкага і Аляксандра Неўскага палка 12 гвардзейскай знішчальнай авіяцыйнай Знаменскай Чырванасцяжнай ордэна Багдана Хмяльніцкага дывізіі.**





Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне на 1-м Украінскім фронце з верасня 1944 года. Франтавы лёс падчас Айчыннай вайны майго бацькі склаўся такім чынам, што яму давялося прыняць удзел у некалькіх буйных аперацыях. Штурмавікі, якіх прыкрываў лётчык-знішчальнік Мікалай Губіна, наносілі магутныя ўдары па ўмацаваных варожых раёнах.

Мой бацька рэдка распавядаў пра свае баявыя дзеянні на фронце. І вось па волі лёсу я ўбачыў узнагародны ліст Мікалаю Лявонцьевічу пра прадстаўленне яго да ўрадавай узнагароды ордэнам «Чырвоная Зорка», падпісаны камандзірам палка гвардыі маёрам Васілём Шаўчуком. У гэтым дакуменце напісана:

«...За перыяд баявых дзеянняў па пашырэнні плацдарму ў нямецкай Сілезіі і ліквідацыі акружанай групіроўкі суперніка ў раёне Опельн з 1 студзеня па 17 красавіка 1945 года Мікалай Губіна ажыццявіў 30 паспяховых вылетаў на суправаджэнне штурмавікоў. Правёў 6 паветраных баёў і 8 самастойных штурмовак. У баі з’яўляецца бясстрашным паветраным байцом, не шкадуючы сваёй сілы і жыцця, першы навязвае бой суперніку, надзейна закрывае штурмавікоў ад нападаў знішчальнікаў суперніка. У паветраных баях паводзіць сябе адважна і дзейнічае рашуча. Не было ніводнага выпадку невыканання баявога задання, а штурмавікі пры яго суправаджэнні не мелі выпадкаў страт ад знішчальнай авіяцыі суперніка».

## НЕЗАБЫЎНЫЯ ПАВЕТРАНЫЯ БАІ

З аповедаў майго бацькі мне запомніўся адзін. У сакавіку 1945 года ён у складзе знішчальнікаў Як-3 вылецеў на прыкрыццё штурмавікоў Іл-2, якія атрымалі заданне атакаваць танкі суперніка. Пры падыходзе да лініі фронту да штурмавікоў з-за аблокаў нечакана наблізілася група нямецкіх знішчальнікаў Ме-109 і паспрабавала атакаваць «ілы». Іх напады былі адбіты некалькімі парамі «якаў». Прайшоў некаторы час, і «месеры» раптам як чорныя каршуны з’явіліся зноў. Мой бацька, каб паглядзець на штурмавікі, якія ён прыкрываў, рэзка адхіліў галаву ў бакавіцу ліхтара кабіны «яка». І ў гэты час раздалася кулямётная чарга па кабіне яго самалёта. Але, на шчасце, кулі не закранулі Мікалая. Ён ізноў пачаў атакаваць суперніка, закрываючы «ілы». У гэтым паветраным баі наша група штурмавікоў Іл-2 і «які», што іх закрывалі, страт не мелі.

За выдатнае выкананне баявых заданняў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Лявонцьевіч Губіна ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны, медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Прагі», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй».

Пасля заканчэння вайны гвардыі старшы лейтэнант Мікалай Губіна працягваў службу ў Ваенна-паветраных сілах. Першапачаткова ў Магілёве, затым ужо ў званні капітана камандзірам авіяцыйнай эскадрыллі ў Бабруйску, пасёлку Рось Ваўкавыскага раёна. Лятаў на рэактыўных самалётах «мігах». У 1958 годзе атрымаў званне маёра авіяцыі і быў камандзіраваны разам з сям’ёй на Камчатку ў горад Ялізава для далейшага праходжання службы ў авіяцыі.

У 1960 годзе лётчык 1 класа Мікалай Губіна ва ўзросце 37 гадоў быў дэмабілізаваны ў сувязі са скарачэннем Узброеных Сіл па ўказанні М. С. Хрушчова. З сям’ёй прыехаў у Мінск, дзе працаваў на Мінскім прыборабудаўнічым заводзе імя У. І. Леніна. За асабліва плённую вытворчую і грамадскую дзейнасць Мікалай Лявонцьевіч Губіна быў узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі і медалём «За шматгадовую добрасумленную працу».

Я вельмі ганаруся сваім бацькам – абаронцам нашай Радзімы. Успамінаю выдатныя святы 9 мая і ўдзел у шэсці Мікалая Лявонцьевіча па праспекце Незалежнасці да помніка Перамогі ў калоне ветэранаў з ордэнамі і медалямі на грудзях.

Славуты шлях майго дарагога бацькі лётчыка Мікалая Лявонцьевіча Губіны адлюстроўваюць радкі выдатнай песні «Нежность» савецкага і расійскага паэта Мікалая Мікалаевіча Дабранравава: «...Он летал, летал, и все звезды ему отдавали свою нежность. Опустела без тебя Земля. Если можешь, прилетай скорей...».

**Валерый ГУБІН,**
**прафесар кафедры рэгіянальнай геалогіі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ, доктар геаграфічных навук**

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс
## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Прафесар** | На пасаду прафесара прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы ці вынаходствы, патэнты, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Дацэнт** | На пасаду дацэнта прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| **Старшы выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гадоў ці вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |

**Біялагічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры генетыкі | 3 гады |
| Загадчык кафедры біяхіміі | 3 гады |
| Загадчык кафедры батанікі | 3 гады |
| Прафесар кафедры малекулярнай біялогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры генетыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры мікрабіялогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры біяхіміі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры малекулярнай біялогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін | 3 гады |
| Дацэнт кафедры заалогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры батанікі | 3 гады |
| Старшы выкладчык кафедры заалогіі | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 10, каб. 212; да 19 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу г. Мінск, вул. Курчатава, 10, каб. 212; да 19 ліпеня.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры агульнай і медыцынскай псіхалогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай камунікацыі | 1 год |
| Прафесар кафедры філасофіі культуры (2 стаўкі) | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 19 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 19 ліпеня.

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Старшы выкладчык кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 234; да 19 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 234; да 19 ліпеня.

**Установа адукацыі «Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» просіць размясціць у газеце «Універсітэт» інфармацыю аб абвяшчэнні конкурсу на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры судовай дзейнасці | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры судовай дзейнасці | 5 гадоў |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. Савецкая, 14, каб. 315; да 19 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. Савецкая, 14, каб. 314; да 19 ліпеня.

**Гістарычны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры гісторыі новага і найноўшага часу | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў | 1 год |
| Прафесар кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў | 1 год |
| Дацэнт кафедры крыніцазнаўства | 1 год |
| Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: гістарычны факультэт, вул. Чырвонаармейская, 6, аўд. 110; да 19 чэрвеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: гістарычны факультэт, вул. Чырвонаармейская, 6, аўд. 208; да 19 ліпеня.

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 21.05.2025 г.
Зак. 454. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*